проведение торжеств, катания на лошодях).

В Брестской области размещается усадьба "У гасцях у пані" – особый тип агроусадеб, потому что объект располагается в старинной панской усадьбе – памятнике архитектуры XIX века. На территории Беларуси находится довольно много старинных усадеб требующих реставрации, возможно, приспособление их под объекты сельского туризма это один из выходов, чтобы спасти памятники от разрушения [2, с. 139]. Имеются они и Витебской области, что представляет собой значительный, пока не использованный потенциал для развития сельского туризма на севере Беларуси.

Сформулированные типологические особенности относятся только к архитектурно-планировочным решениям объектов сельского туризма. В основном хозяева усадеб ориентируются на потребителя, которому важен комфорт и маловажны традиции и самобытность места, где находится их усадьба. Но есть туристы, а их становится с каждым годом все больше, которые нацелены на получение информации о жизни людей в белорусской деревне, о культуре и традициях. И это не только иностранные приезжие, но еще и городские жители нашей страны. Сельская туристическая усадьба – информационный носитель культуры белорусского народа, а какую информацию она будет предлагать, в том числе и средствами архитектуры, зависит от её хозяев.

Все более развивающаяся сеть усадеб сельского туризма, безусловно, может оказать содействие любым формам трансграничного сотрудничества в сфере туристической деятельности. Традиционные подходы к феномену государственных границ сменяются новыми взглядами, которые в тандеме с традициями, рассматривают главным образом приграничную/региональную идентичность и взаимодействие.

1. Сергачев, С.А. Архитектурно-типологическая характеристика объектов сельского туризма Беларуси / С.А. Сергачев, М.С. Черкасова // Архитектура и строительные науки. – 2012. – № 2–3. – С. 36–38.
2. Киселева, М.С. Особенности типологии усадеб сельского туризма Беларуси (на примере Брестской области) / М.С. Киселева// Архитектурное наследие Прибужского региона. Сохранение и культурно-туристское использование. Сб. науч. тр. III междунар. науч.-практ. конф., 29–30 мая 2012 г., Брест. – Брест : БрГТУ. 2012. – С. 136–140.

**Вайцешчык Г.С.**

## АРХІТЭКТУРА МЯСТЭЧАК ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.): ДА ПРАБЛЕМЫ ЗАХАВАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Гродна, Рэспубліка Беларусь

Былыя мястэчкі – найкаштоўнейшая спадчына гарадской цывілізацыі, “мікрамадэль” Беларусі, культурна-гістарычны феномен

Репозиторий ВГУ

нашага мінулага. У эвалюцыйным развіцці большасць гарадоў Беларусі прайшлі стадыю малога горада (у мінулым – мястэчка), што яскрава сведчыць аб агульнасці працэсаў фарміравання горадабудаўнічай сеткі ў розных рэгіенах краіны XX стагоддзя. Разуменне механізмаў і спецыфічных характарыстык грамадскага жыцця ва ўзаемасувязі з прасторавым светам архітэктурных аб’ектаў дазваляе мэтанакіравана фарміраваць навакольнае асяроддзе чалавека, захоўваючы яго каштоўныя гістарычныя якасці. Гэта асабліва актуальна ў наш час, калі інвестыцыйная прывабнасць зямлі ў невялікіх населеных пунктах (гарадскіх паселках і весках) з’яўляецца галоўнай прычынай будаўнічых пераўтварэнняў архітэктурнага аблічча населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь (агратурызм).

Адметнай рысай архітэктуры мястэчкаў Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. з'яўлялася перавага драўлянай забудовы, якая ўяўляла сабой новы этап у развіцці архітэктуры, і арганічнае спалучэнне народнага дойлідства са стылёвай архітэктурай.

Неабходна адзначыць, што архітэктура мястэчак даследуемага рэгіёна ў 1921-1939 гг. развівалася ў накірунку польскіх і заходнееўрапейскіх працэсаў, аднак мела своеасаблівыя рысы, абумоўленыя прыродна-геаграфічнымі ўмовамі, а саблівасцямі тэрытарыяльнага і гаспадарчага асваення рэгіена і сацыяльна-эканамічнымі фактарамі. З улікам гэтых умоў асаблівае значэнне для тагачаснага местачковага грамадства мела развіцце функцыянальнага занавання тэрыторый (фарміраванне працяглага цэнтра, выдзяленне жылога сектара, адміністрацыйных, прамыслова-гандлёвых зон).

Грамадскія будынкі, пабудаваныя ў 20-30 гг. XX ст. у мястэчках Заходняй Беларусі дэманстравалі значную разнастайнасць пластычных і кампазіцыйных вырашэнняў, арганічнае спалучэнне розных архітэктурных стыляў і напрамкаў.

Прыкладам класіцыстычнага напрамку з’яўляецца адміністрацыйны будынак у Браславе (інжынера Гірона), пабудаваны ў 1928-1929 гг. Будынак складаецца з цэнтральнага і двух бакавых карпусоў, злучаных пераходамі. Уваход вылучаны 4-калонным порцікам іанічнага ордэна, завершаным ступенчатым атыкам [1, с. 386]. У 1936-1938 гг. была зроблена прыбудова да будынка гімназіі ў Шчучыне, у якой назіраліся авангардныя рысы. Новыя і старыя карпусы былі злучаны паўцыліндрычным аб’емам. Уваход акцэнтаваны балконам, які падтрымліваюць апоры і які выконвае ролю казырка [1, с. 447].

Грамадскія пабудовы Браслава мелі рысы “закапанскага” стылю, які знайшоў адлюстраванне ў архітэктуры польскага горада Закапане, у творчасці архітэктара С. Віткевіча, які вылучаўся пластычнымі скатнымі дахамі, высокімі бутавымі фундаментамі, выкарыстаннем



Репозиторий ВГУ

сялярных сімвалаў у шчыпцах дахаў. Сіметрычная кампазіцыя 2-павярховага драўлянага будынка заезднага дома ў Браславе (1930-я гг.) акцэнтавана звернутым да возера ўваходным аб'ёмам з порцікам на 1-м паверсе, завершаным франтонам [1, с. 421].

Прыёмы нацыянальнага рамантызму, пераасэнсаваныя элементы народнага дойлідства шырока ўвайшлі ў практыку грамадскага будаўніцтва. У якасці прыкладаў можна прывесці будынкі гміннай управы ў Зэльве (1932 г.), дзяржаўнага шпіталю ў Браславе (1933 г., архітэктар В. Руткоўскі), будынак добраахвотнай пажарнай каманды ў Міёрах (1937 г. Браслаўскі павет), дом народны ў Дзісне (30-я гг. ХХ ст.), будынак павятовай адміністрацыі ў Паставах (1926-1928 гг.), чыгуначны вакзал у Скідзелі (30-я гг. ХХ ст.) і інш. [2, с. 75].

У параўнанні з усходнімі абласцямі, у Заходняй Беларусі ў меншай ступені распрацоўваецца тып сацыяльнай архітэктуры, якая павінна была ўплываць на сацыяльныя працэсы ў грамадстве. Пабудовы мястэчак Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. – камфортныя асабнякі і малапавярховыя жылыя дамы, прызначаныя для ўласнага заказчыка.

Асабнякі, пабудаваныя ў мястэчках Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., характарызуюцца функцыянальнай дакладнасцю планіроўкі, пластычнасцю прасторавых суадносін аб'ёмаў рознай вышыні, выкарыстаннем адкрытых тэрас. У авангарднай стылістыцы вырашаны асабняк на вуліцы Леніна ў Шчучыне Навагрудскага ваяводства [3, іл. №115]. Архітэктура жылога дома дзяржаўнага служачага ў Браславе, пабудаванага ў 1924-1926 гг., спалучала авангардныя рысы са стылем Арт Дэко [3, іл. №135].

Класіцыстычныя рысы прасочваюцца ў сядзібнай забудове, узведзенай у 1920-я гг. у Валожыне Навагрудскага ваяводства. Жылыя 1-павярховыя дамы па вуліцы Горкага 4, 7, 10 драўляныя, з высокімі вальмавымі дахамі, сіметрычнай кампазіцыі, цэнтр якой вылучаны мансарднымі аб'ёмамі з лучніковымі люкарнамі [1, с. 423]. У класіцыстычным напрамку быў выкананы дом купца ў Падброддзі Віленскага ваяводства ў 20-х гг. ХХ ст. [4].

У архітэктурным абліччы вытворчых будынкаў (млыноў, заводаў, гаспадарчых пабудоў) пераважалі простыя і лаканічныя рашэнні. Вядомыя з сераднявечча дамы рамеснікаў (рамесных майстэрняў і дробных фабрык) у 20-30 гг. ХХ ст. складаліся з жылой часткі (звычайна размяшчаліся з боку двара) і службовай (арыентаванай на вуліцу), падзеленых капітальнай сцяной, мелі ад 3 да 6 пакояў (жылыя пакоі, майстэрню, камору). Многія з іх і сёння ствараюць перспектывы вуліц і панарамы гандлёвых плошчаў [4].

У архітэктурна-прасторавай арганізацыі асяроддзя і візуальным успрыняцці мастацкага аблічча мястэчка важную ролю адыгрывалі



Рэпазіторый ВДУ

даміннанты, вертыкальныя акцэнты - культавыя збудаванні, якія вызначалі індывідуальнасць і адметнасць кожнага мястэчка.

У Польскай дзяржаве афіцыйнай падтрымкай карысталася каталіцкая царква, таму найбольш актыўна ўзводзіліся менавіта касцёлы. Праўда, такіх велічных і манументальных барочных збудаванняў, як у даваенны час не было. Самыя вялікія парафіі ўжо мелі мураваныя храмы, а тыя што толькі ўзніклі, значна саступалі ім у памерах і пышнасці. У 1921-1939 гг. у мястэчках Палескага ваяводства новыя касцёлы ў барочным і гатычных стылях, як сведчаць архіўныя крыніцы, былі пабудаваны ў Драгічыне (1928 г.), Ганцавічах (30-я гг. XX ст.), Антопалі (1938 г.) [4; 5, л. 37; 6].

У канцы 1920-х гг. у сакральным дойлідстве імкліва пачынае стварацца нацыянальны стыль у рэчышчы нацыянальнага рамантызму. Пачынальнікам беларускага стылю ў драўляным будаўніцтве стаў Леў Вітан-Дубейкаўскі, які спраектаваў царкву старавераў у Відзах, мястэчку Віленскага ваяводства. У беларускім стыле было выканана яшчэ некалькі праектаў: касцёл у Дукштах (1933 г. архітэктар В. Фаркевіч), касцёл у Слабодцы (1932 г.), касцёл у Быцені (1930 г.), касцел у Варапаева (1934 г.), касцел у Солах (30-я гг. XX ст.) [2, с. 52; 4; 7, л. 1-2 адв.].

Моцнай плынню рамантызму ў местачковай архітэктуры была неараманіка. Уплыў неараманікі можна прасачыць на прыкладзе касцёлаў у Іказні, Браславе, Опсе, базілікі ў Слабодцы [8, с. 108].

Арганізаванай адзінкай прасторы мястэчка, яго архітэктурнай дамінантай былі сінагогі. Польскія даследчыкі яўрэйскага культавага дойлідства Марыя і Казімір Пяхоткі адзначалі ў сваіх працах, што пасля Першай сусветнай вайны на землях ІІ Рэчы Паспалітай скончыўся перыяд будаўніцтва вялікіх харальных сінагог і, ў першую чаргу, гэта было звязана з адтокам яўрэйскага насельніцтва з міжваеннай Польшчы ў Палестыну [9, с. 164].

Местачковыя сінагогі 20-30 гг. XX ст. па стылю былі набліжаны да помнікаў архітэктуры XVIII ст., да барочных і класіцыстычных архітэктурных традыцый. Па праектах гэтыя сінагогі збліжаны да квадрата, з высокім мансардавым дахам, без ярка выражанай стылістычнай афарбоўкі [9, с. 164–165].

Яўрэйскія сінагогі, як трапна адзначыў у сваёй працы Т. Вішнеўскі “да верасня 1939 г. былі пастаянным архітэктурным пейзажам гарадоў, мястэчкаў і нават вёсак Беластоцкага ваяводства” [10, с. 87]. У некаторых мястэчках разам з галоўнай сінагогай магло быць да 5 яўрэйскіх малітвеных будынкаў (Валожын, Паставы, Маладзечна, Драгічын, Зэльва) [11, Т. 1. с. 286, 338, 443; Т. 2. с. 176; Т. 3. с. 513].

Ад пачатку XX ст. будынкі новых сінагог сталі сумяшчаць з сінагагальнымі школамі, дамамі равіна, рытуальнымі рэзнямі,



Рэпазіторый ВДУ

бальніцамі. Нярэдка пры сінагогах будаваліся і цэрыманіяльныя купальні – міквы. У Іўі і Орлі акрамя галоўнай сінагогі ў 20-30 гг. ХХ ст. можна было ўбачыць некалькі іншых будынкаў яўрэйскай гміны: дамы малітвы, дом рабіна, рытуальная рэзня, бальніца, школа і дзіцячы садок (бейт-мідраж), міква [13, с. 42–43].

Акрамя галоўнай сінагогі (AlteShul) ў мястэчках будаваліся хасідскія бажніцы (HasidimSztibl), якіх яшчэ называлі клаусамі. У архітэктурным плане гэта былі звычайныя жылыя будынкі без архітэктурнага афармлення, якія налічвалі ў сярэднім 20-30 вернікаў. На яўрэйскіх могілках будаваліся паграбальныя дамы, у якіх адпавялі пакойнікаў “бэйт-тахара” (Крынкі, Даўгінава, Ляндварава) [2, с. 36; 12, л. 1-1 адв.]. Талмуд заахвочваў да стварэння маленькіх сінагог (дамоў мадлітвы) пры бальніцах, прытулках, фабрыках, усюды, дзе кіраўніком ці ўладальнікам быў набожны яўрэй. На стварэнне такой сінагогі была неабходна наяўнасць 10 дарослых вернікаў (з 13 гадоў) [10, с. 37].

У 20-30 гг. ХХ ст. праводзілася значная праца па структурызацыі кіраўніцтва аховы помнікаў, іх інвентарызацыі, а таксама рэстаўрацыі. Навукова-даследчыя ўстановы, такія як Цэнтральнае упраўленне інвентарызацыі помнікаў архітэктуры ў Варшаве, аддзел архітэктуры Варшаўскага тэхналагічнага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам прафесара Оскара Сасноўскага пачалі праводзіць інвентарызацыю і рэканструкцыю помнікаў яўрэйскага культавага дойлідства XVIII – XIX ст. Драўляныя сінагогі Беластоцкага (Азёры, Воўпа, Сідра, Пяскі, Крынкі), Навагрудскага (Быцень, Іўе, Воранава), Віленскага (Алькенікі), Палескага (Камянец-Літоўск, Давід-Гарадок, Янова) былі апісаны гэтымі навуковымі цэнтрамі і ўключаны ў спіс помнікаў архітэктуры і мастацтва Польшчы [9, с. 175]. На такія будынкі накладвалася забарона па іх знішчэнню, перабудаванню і рамантаванню без згоды адпаведных дзяржаўных структур. Інвентарызацыю і архітэктурнае апісанне 30 яўрэйскіх драўляных сінагог Гродзенска-Беластоцкай групы правёў гісторык, мастацтвазнаўца Шымон Зайчык. Ім была створана ўнікальная калекцыя фотаздымкаў гэтых сінагог і іх праектаў, частка якой захоўваецца ў аддзеле мастацтва Польскай Акадэміі навук у Варшаве. На вялікі жаль, большасць драўляных сінагог Гродзенска-Беластоцкай групы (85%) была знішчана падчас другой Сусветнай вайны ці разабраны ў гады савецкай улады.

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь выпрацоўваецца новая горадабудаўнічая стратэгія, заснаваная на прызнанні каштоўнасці гістарычна-архітэктурнага асяроддзя і захаванні яго як інфармацыйнай сістэмы, якая патрабуе правядзення ў жыццё палітыкі «аховы помнікаў культуры» з усебаковымі мерамі па абароне,

Рэпазіторый ВДУ

кансервацыі, рэканструкцыі, рэнавацыі, рэстаўрацыі архітэктурнай спадчыны, яе адаптацыі да сучасных умоў. На сёняшні дзень мноства аб'ектаў мураванай і драўлянай архітэктуры заходнебеларускіх мястэчак занесены ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца пад абаронай дзяржавы. Аднак, аналіз гэтага спісу паказвае, што такімі помнікамі, за рэдкім выключэннем, лічацца толькі культавыя пабудовы – цэрквы, касцелы і сінагогі. Шараговая забудова не выклікае цікавасці і ўвагі ў дзяржаўных экспертаў. Такім чынам, падчас жыллёва-будаўнічай дзейнасці мы кожны год трацім па ўсёй краіне мноства цікавых архітэктурных аб'ектаў, якія ўжо ніколі нельга будзе аднавіць. Галоўнай прычынай такой з'явы – адсутнасць спецыяльных навуковых даследаванняў, якія б далі магчымасць выявіць культурную і сацыяльную каштоўнасць гістарычнай забудовы невялікіх населеных пунктаў Беларусі. Рэалізацыя канцэпцый суіснавання "старога" і "новага" у архітэктурным абліччы мястэчка і захаванні яго як аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны магчыма толькі на аснове сістэмнага навуковага аналіза працэса фарміравання такіх архітэктурных элементаў як вулічная планіроўка, гістарычная забудова жылога сектара, аб'ёмна-планіровачныя, канструктыўныя, стылістычныя асаблівасці будаўніцтва грамадскіх і культавых пабудоў.

1. Архітэктура Беларусі. Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславанскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 тамах. Т. 4. Кніга 2. XX - пачатак XXI ст. / А.І. Лакотка, Г.А. Патаеў, Э.М. Кляўко, Ю.У. Чантурыя. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 465 с.
2. Харэўскі, С. Культавае дойлідства Заходняй Беларусі 1915-1940 гг. / С. Харэўскі. – Мінск, 1997.
3. Шамрук, А.С. Архитектура Беларуси XX – XXI в.: эволюция стилей и художественных концепций / А.С. Шамрук. – Минск: Белорус. наука. 2007. – 335 с.
4. Населеныя пункты Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] / Рэжым доступа: http://www.radzima.org. – Дата доступа: 01.06.2012.
5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Фонд 1. – Воп.1. – Спр. 2042. Дело о постройке и ремонте костелов, часовни в Полесском воеводстве за 1923 – 1927.
6. Архіў Інстытута Мастацтва Польскай Акадэміі Навук. – ISPAN 0000010981. Касцел у Драгічыне.Фота A.Bochnig.
7. Arhiwum Akt Nowych w Warszawe (AAN w Warszawe). –Zespół. 9. – Sygn. 3309. Project kościołą w m-ku Soły.
8. Харэўскі, С. Нацыянал-рамантызм у архітэктуры 10-20-х гадоў XX ст. (паводле матэрыялаў Браслаўшчыны) / С. Харэўскі. // Браслаўскія чытанні: мат-лы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі 24-25 красавіка 1997. – Браслаў, 1997. – С. 108.
9. Piechotek, M. Bramy Nieba: bożnice drewniane na ziemiach dawnej Rzeczypospolitej / M. Piechotek, K. Piechotek. – Warszawa: w-wo Krupski i s-ka, 1996. – 416 s.
10. Wiśniewski, T. Bóżnice Białostocczyzny / T. Wiśniewski. – Białystok: David, 1992. – 219 s.
11. The Encyclopedia of Jewish Life before and during Holokost / S. Spoctor, G. Wigoder, E. Wiesel: 3 T. T. 1–3.– Jerusalem: New York Uniwersity, 2001-2004.
12. AAN w Warszawe. –Zespół 9. – Sygn. 2824. Project żydowskiej kaplicy cmentarżnej w m-ku Landwarowie.
13. Zabytki arhitektury i bydownictwa w Polsce: województwo Białystockie. T. 3. – Warszawa: ośrodek dokumentacji zabytków, 1992. – 370 s.

Репозиторий ВГУ